*Шунейка Вольга*

## З цыкла «Колеры пачуццяў»

«Свет расквеціўся ўсімі колерамі вясёлкі...» – як часта мы гаворым такія словы і не задумваемся, а ці сапраўды свет для нас каляровы? Ці толькі навакольныя рэчы маюць колер? Можа быць, і пачуцці – каханне, радасць, смутак?

## Колеры смутку

У дзяцінстве смутак шэры: шэры свет, шэры дождж, шэры настрой, таму што захварэла і мама не пускае да сяброў. І зусім не радуюць ні любімыя прысмакі, ні вясёлы мульцік, ні цікавая кніга. Шэрасць наўкола і шэрасць у душы. Таму ты ляжыш у ложку і сумуеш, чакаючы сонейка і пакуль адступіць хвароба, каб зноў пабегчы на вуліцу.

Маладосць – час надзей, спакусаў і пачатку. Пачатку ўсяго. Дарослага жыцця. Нараджэння пачуццяў. Пазнання свету. І смутак мае колер фіялетава-бэзава-блакітны на белым, як зімовы неруш адвячоркам пад ліхтаром. Смутак, напоўнены прадчуваннем і надзеяй, крышталёвай акварэллю кладзецца на зямлю, адгукаецца хрускім снегам і звонкім ад марозу паветрам.

У сталасці ўспрыманне зусім іншае. Усе жарсці трохі супакоіліся, і смутак стаў празрыстым, светлым, колеру залатой восені. Так сумуеш аб нечым нязбыўным, тым, пра што марылася ў маладосці, але не спраўджаным так, як хацелася. Шырокія мазкі пэндзля з фарбамі мёду – грачышнага, ліпнёвага, канюшыннага – кладуцца на палатно жыцця, як на карцінах Грэма Геркена, пакідаючы лёгкі паслясмак горычы ў сэрцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ